

Дзяніс
МАРЦІНОВІЧ
Студэнт
Белдзяржуніверсітэта

# «Педагагічная паэма» Кнорына

**З кіраўнікоў Беларусі савецкага перыяду педагогамі па адукацыі былі тры чалавекі. Пётр Міронавіч Машэраў, які закончыў Віцебскі педагагічны інстытут, выкладаў у 1939—1941 гг. матэматыку і фізіку ў Расонскай сярэдняй школе. Ціхан Якаўлевіч Кісялёў, выпускнік Гомельскага педагагічнага інстытута (1941), з 1936 г. настаўнічаў у Ельскім раёне, у Вялікую Айчынную вайну працаваў настаўнікам, а потым дырэктарам школы ў Сталінградскай вобласці. Але педагагічная дзейнасць абодвух была параўнальна непрацяглай: пасля вайны Кісялёў і Машэраў перайшлі на камсамольска-партыйную працу, якая пазней прывяла іх да вышэйшай пасады ў рэспубліцы (Кісялёў змяніў Машэрава на пасадзе першага сакратара ЦК КПБ).**

## Спачатку было настаўніцтва

І толькі адзін кіраўнік Беларусі ніколі не парываў сувязяў з адукацыйнай сістэмай, хоць у яго працы на ніве адукацыі таксама былі перапынкі, абумоўленыя разнастайнымі абставінамі. Гаворка ідзе пра Вільгельма Кнорына, які ўзначальваў беларускую партыйную арганізацыю ў 1920—1922, а таксама ў 1927—1928 гг. Кнорын, латыш па нацыянальнасці, таксама атрымаў дыплом педагога: у 1910 г. ён закончыў настаўніцкую семінарыю ў г. Валміера. У педагагічнай дзейнасці Кнорына можна вылучыць тры перыяды.

Першы, латвійскі, перыяд (1910—1914, з перапынкамі) звязаны з непрацяглай працай другім настаўнікам Страўпскай прыходскай школы (жнівень 1910 г.), настаўнікам гандлёвай школы таварыства выкладчыкаў (так званае «вучылішча Одыня») горада Рыгі (лета 1913 г.), выкладчыкам на курсах рыжскага таварыства асветы і ўзаемадапамогі «Лібарэмус», працай якога кіравала нелегальная арганізацыя Сацыял-дэмакратыі Латышскага краю (СДЛК) (яе членам Кнорын з'яўляўся ў 1913—1914 гг.). А ў 1914 г. з пачаткам Першай сусветнай вайны Кнорына забралі ў армію, і ён надоўга адышоў ад педагагічнай працы.

Другі, беларускі, перыяд таксама быў храналагічна непрацяглы. Ён ахоплівае 1921—1922 і 1927—1928 гг. і звязаны з адкрыццём восенню 1921 г. Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Разам з прыёмам ва універсітэт студэнтаў неабходна было падабраць і выкладчыкаў: наладжанай сістэмы падрыхтоўкі мясцовых кад-

раў яшчэ не было. Таму вырашылі запрашаць выкладчыкаў адусюль, дзе існавалі традыцыі універсітэцкай адукацыі, а таксама прыцягнуць спецыялістаў, якія ўжо даўно звязалі свой лёс з Беларуссю. Першымі прафесарамі БДУ Дзяржаўны вучоны савет зацвердзіў больш як 16 чалавек. Ганаровае званне атрымалі У. Ігнатоўскі (выкладаў гісторыю Беларусі), У. Іваноўскі (чытаў лекцыі па філасофіі і педагогіцы), Дз. Жарынаў, Дз. Канчалоўскі, М. Нікольскі, У. Перцаў, У. Пічэта, А. Савіч, Ф. Турук (усеагульная гісторыя), М. Янчук (этнаграфія), С. Вальфсон (філасофія), М. Кроль (медыцына), Б. Беркенгейм (хімія), П. Карзунін (анатомія), А. Фядзюшын (заалогія). Прафесарам стаў і В. Кнорын, які чытаў лекцыі па палітэканоміі[1] (курсы «Эканамічная палітыка» і «Эканоміка пераходнага перыяду»). Прафесар С. Вальфсон, які ў той жа час выкладаў у БДУ філасофію і педагогіку, узгадваў пра В. Кнорына: «...мы ўгаварылі яго ўзяць чытанне курса па эканоміцы пераходнага перыяду... З выключнай акуратнасцю выконваў ён абавязкі выкладчыка...»[2]. Усяго першы вучэбны год акрамя названай вышэй прафесуры пачалі 49 выкладчыкаў і 10 асістэнтаў, а таксама 1390 студэнтаў[3]. Але лекцыі ў БДУ Кнорын чытаў толькі адзін навучальны год, бо ў маі 1922 г. быў пераведзены на працу ў Маскву. У другі раз выкладаў у БДУ ў 1927/28 навучальным годзе[4], калі працаваў у Беларусі першым сакратаром ЦК КП(б)Б.

## Ленінская школа

Трэці перыяд у педагагічнай дзейнасці В. Кнорына звязаны з працай у Камуністычным Інтэрнацыянале (Камінтэрне) і ахоплівае прыкладна 1928—1935 гг. Па лініі гэтай арганізацыі Кнорын выкладаў у Міжнароднай ленінскай школе (МЛШ), якая была створана ў 1926 г. першапачаткова як міжнародныя ленінскія курсы для падрыхтоўкі партработнікаў зарубежных кампартый пры Інстытуце Маркса—Энгельса—Леніна. Тут вучыліся актывісты нацыянальных кампартый, якія мелі вопыт практычнай рэвалюцыйнай барацьбы, але не атрымалі сістэматычнай адукацыі. Школа падзялялася на некалькі сектараў паводле моўнага прынцыпу. Найбольш значным па колькасці слухачоў і ўзроўню іх падрыхтоўкі быў нямецкі сектар, дзе займаліся прадстаўнікі Германіі, Аўстрыі, Скандынаўскіх краін і нават Люксембурга. Значнасць гэтага сектара патлумачыць дастаткова лёгка, паколькі Камуністычная партыя Германіі нездарма лічылася адной з самых моцных у Заходняй Еўропе. Разам з іншымі знакамітымі дзеячамі бальшавіцкай партыі (напрыклад, М. Бухарыным, М. Пакроўскім) там выкладаў і В. Кнорын, паколькі адказваў за гэты напрамак у Камінтэрне[5]. На чале МЛШ стаяў рэктар (з 1928 г. гэту пасаду займала К. Кірсанава, жонка Е. Яраслаўскага), але непасрэдна яе працай кіравала праўленне, у якое акрамя Кірсанавай уваходзілі ўплывовыя дзеячы Камінтэрна таго часу — В. Пятніцкі, В. Пік, Ван Мін, П. Тальяц, С. Гопнер і В. Кнорын.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы